# «ПРАЦАВАЦЬ У РЭЖЫМЕ ЭКАНОМІІ І ПОШУКУ»

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А. Р. Лукашэнка 30 чэрвеня 1999 года прыняў са справаздачай прэм'ер-міністра С. С. Лінга.

Як паведаміла прэс-служба кіраўніка дзяржавы, кіраўнік урада інфармаваў прэзідэнта аб сваім візіце ў Літву, дзе праходзілі Дні Рэспублікі Беларусь. У прыватнасці, аб сустрэчы з прэзідэнтам суседняй дзяржавы В.Адамкусам, якому было перададзена запрашэнне беларускага прэзідэнта наведаць Рэспубліку Беларусь з візітам. Запрашэнне з удзячнасцю было прынята.

Прэм'ер-міністр паведаміў таксама аб выніках перагавораў са сваім літоўскім калегам аб удзеле ў сустрэчах з дзелавымі коламі, прадстаўнікамі беларускай дыяспары, у цырымоніі адкрыцця пасольства Рэспублікі Беларусь ў Вільнюсе.

Прэзідэнт даручыў ураду прадоўжыць намаганні па паглыбленню ўзаемавыгаднага гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва з Літвой, якая з'яўляецца адным з важных партнёраў Беларусі ў гэтай сферы, па развіццю ўсяго комплексу двухбаковых адносінаў у духу добрасуседства і ўзаемаразумення.

Кіраўніку дзяржавы дакладана аб выкананні бюджэту за шэсць месяцаў гэтага года. Падкрэслівалася, што даходная частка бюджэту выканана — за паўгоддзе атрымана 50 працэнтаў ад яе запланаванага гадавога аб'ёму. С. С. Лінг праінфармаваў аб тым, як прафінансаваны асноўныя народнагаспадарчыя галіны. Прэзідэнт даручыў дэталёва разгледзець вынікі выканання бюджэту па ўсіх напрамках як на рэспубліканскім, так і на мясцовых узроўнях. Кіраўнік дзяржавы ўказаў на неабходнасць працягваць працаваць у рэжыме вельмі жорсткай эканоміі, старанна вывучаць усе магчымыя крыніцы папаўнення бюджэту. Вызначаючы задачы на бліжэйшую перспектыву, прэзідэнт запатрабаваў сканцэнтраваць увагу перш за ўсё на ўводзімых аб'ектах сацыяльнага прызначэння: бальніцах, школах, інтэрнатах, жыллі, спартыўных збудаваннях. Па кожнаму з іх, падкрэсліў кіраўнік дзяржавы, павінны быць устаноўлены канкрэтныя тэрміны ўводу ў строй. Ураду, міністэрствам, выканкамам неабходна забяспечыць вельмі строгі кантроль на гэтым напрамку. На разгляд прэзідэнта ўнесены праект Указа, які прадугледжвае ўстанаўленне адпаведных тэрмінаў выканання работ па сацыяльна значных аб'ектах у залежнасці аб аб'ёмаў фінансавання, а таксама адказнасць за іх своечасовы ўвод у эксплуатацыю.

Прэзідэнцкая бібліятэка Рэспублікі Беларусь

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы